Станіслаў Суднік



Кароткі расейска-беларускі вайсковы слоўнік

Незалежная выдавецкая кампанія
'ТЭХНАЛОГІЯ'
Менск, 1993г.

ЗГУРТАВАНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ
ЗАДЗІНОЧАНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ

КАРОТКІ РАСЕЙСКА-БЕЛАРУСКІ ВАЙСКОВЫ СЛОЎНІК

©УКЛАДАЛЬНІК:
С.Суднік

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
М.Бірукоў, кандыдат тэхнічных навук, падпалкоўнік
А.Белакоз, настаўнік-метадыст

Слоўнік зьмяшчае больш 1000 тэрмінаў па асноўных галінах вайсковай справы. У дадатку пададзеныя практычна ўсе ўжывальныя шыхтовыя і пазашыхтовыя вайсковыя каманды.

Слоўнік прызначаецца вайскоўцам Узброеных Сіл, навучэнцам і выкладчыкам вайсковай справы ў навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

Аўтар выказвае падзяку фундатарам выданьня гэтага слоўніка:

Незалежнай выдавецкай кампаніі "Тэхналогія" (прэзідэнт В. Багдановіч)
Задзіночаньню Беларускіх Студэнтаў
фірме "Сэго"
акцыянернаму таварыству "Кросны"

Незалежная выдавецкая кампанія
'ТЭХНАЛОГІЯ'
Менск, 1993г.



ПРАДМОВА

Станаўленне беларускай дзяржаўнасці крок за крокам рушыць наперад разам з развіццём дзяржаўнай мовы. Пашырэнне ўжывання беларускай мовы ў розных сферах нашага жыцця і дзяржаўнага будаўніцтва патрабуе неадкладнай распрацоўкі, а то і стварэння цэлых пластоў лексікі, якія за гады польскага панавання, расейскага прыгнёту і бальшавіцкага інтэрнацыяналізму ня толькі не развіваліся, а наадварот, зьнікалі.

Так нераспрацаванымі аказаліся навукова-тэхнічная, мастацкая, грамадска-палітычная, эканамічная і шмат якія іншыя тэрміналогіі, у тым ліку тэрміналогія вайсковая. Гэта тым больш недарэчна для народа, які меў багацейшую у свеце вайсковую гісторыю і на працягу некалькіх стагоддзяў рухаў наперад сусветную вайсковую навуку.

Прапанаваны слоўнік мае на мэце, наколькі магчыма, выправіць гэты недахоп. Ен уяўляе сабой выбарку з сямітысячнага расейска-беларускага вайсковага слоўніка, рукапіс якога ўжо скончаны, але патрабуе пэўнага часу на дапрацоўку.

Прынцыпы ўкладання:

1. Аснову слоўніка складае сучасная беларуская лексіка, прысвечаная вайсковай ці блізкай да яе тэматыцы: такія словы як выбух, стрэльба, набой, запал, перамога, варта, мяжа, абарона; ратаваць, ахоўваць, зьнішчаць, загадваць і г.д.

2. Асобнай грамадой вылучаюцца гістарызмы - вайсковыя тэрміны, якія ў розныя часы існавалі на Беларусі (шыхт, штандар, залога, вой, жаўнер, рокаш і інш.).

3. На беларускай лексіцы грунтуюцца і многія спецыфічныя вайсковыя тэрміны (зьнішчальнік, збройня, вартаўнічы,інш.) і слова-злучэнні ("крокам руш!", выказваць пашану, вайсковая годнасць і г.д.).

Наватворы ствараліся ў строгай адпаведнасці з правіламі беларускага словаўтварэння, з дапамогай уласна беларускіх суфіксаў і прыставак.

4. Пэўнае месца займаюць у слоўніку запазычаныя словы, якія прайшлі адаптацыю да беларускай мовы. Пры гэтым транслітэрацыя кірыліцай рабілася па магчымасці з той мовы, у якой гэтае слова ўзнікла.

Словы ў слоўніку размешчаны адпаведна з расейскім алфавітам.

Усе састаўныя тэрміны размяшчаюцца пры асноўным, пасля яго ў алфавітным парадку. Асноўны тэрмін у састаўным расейскім скарачаецца да адной літары, беларускія тэрміны даюцца поўнасцю.

У рабоце над слоўнікам актыўны ўдзел прымалі сябры Беларускага згуртавання вайскоўцаў і ў першую чаргу маер Ігар Супаненка і лейтэнант запасу Сяржук Чыслаў, за што выказваю ім самую шчырую падзяку.

Станіслаў Суднік

А

авангард	авангард
аварийно-спасательный	аварыйна-ратавальны
авианосец	авіяносец
авиация	авіяцыя
а.войск противовоздушной обороны	авіяцыя войск супрацьпаветранай абароны
бомбардировочная а.	бамбавальная авіяцыя
гражданская а.	цывільная авіяцыя
истребительная а.	знішчальная авіяцыя
автомат	аўтамат
автомобиль	аўтамабіль
гусеничный а.	тракавы аўтамабіль
автопилот	аўтапілот
академия	акадэмія
аккумулятор	акумулятар
антенна	антэна
всенаправленная а.	ўсенакіраваная антэна
штыревая а.	прутковая антэна
аппарель	апарэль
армия I *(Вооруженные Силы)*	войска
действующая а.	дзейснае войска
армия II *(объединение)*	армія
арсенал	зброўня, арсенал
артиллерия	артылерыя
а.на гусеничной тяге	артылерыя тракавай цягі
а.усиления	артылерыя ўзмацнення
истребительно-противотанковая а.	знішчальна-супрацьтанкавая артылерыя
арьегард	ар'егард
атака	атака
ложная а.	падманная атака
аттестат	атэстат
аэродром	аэрадром
а. базирования	аэрадром базавання
аэроснимок	аэраздымак
аэростат	аэрастат

Б

база снабжения	база забеспячэння
базироваться	базавацца
бак	бак
топливный б.	паліўны бак
бактерии	бактэрыі
баллистический	балістычны
барражирование	патруляванне
батальон	батальён
отдельный б.	асобны батальён
разведывательный б.	разведвальны батальён
батарея	батарэя
башня	вежа
б.танка	вежа танка
бегство	уцёкі
безопасный	бяспечны
билет	аркуш, картка, білет, квіток
отпускной б.	адпускны аркуш
бинокль	бінокль
битва	бітва
благодарность	падзяка, удзячнасць, пахвала
объявлять б.	выносіць падзяку
блиндаж	бліндаж
блюдо *(пища)*	страва
первое б.	першая страва
боеготовность	боегатоўнасць
боеприпасы	ладункі
боеспособность	боездольнасць
боец	вой, воі
бой	бой
бойница	байніца
болезнь	хвароба
бомба	бомба
глубинная б.	глыбінная бомба
зажигательная б.	запальная бомба
светящаяся б.	светлавая бомба
бомбардировка	бамбаванне
бомбардировщик	бамбавальнік
б.-носитель ядерного оружия	бамбавальнік-носьбіт ядзернай зброі
бомбометание	бомбакіданне
бомбоубежище	бомбасховішча
борьба	барацьба, змаганне
брешь	пралом, прабоіна
бригада	брыгада
бронебойно-зажигательный	бранябойна-запальны
бронетранспортер	бронетранспарцер
бросок в атаку	кідок у атаку
бруствер	бруствер
буссоль	бусоля

В

ведомость	ведамасць, аркуш
постовая в.	вартавы аркуш
ведомый	вядомы
ведущий	вядучы
вентиляция	вентыляцыя
вероятность	імавернасць
вертикаль	вертыкаль
вертолет	верталёт
вес	вага́
в. в боевом положении	вага ў баявым стане
веха	тычка
вещество	рэчыва
взрывчатое в.	выбуховае рэчыва
отравляющее в.	атрутнае рэчыва
взвод	звяз
в. управления	звяз кіравання
взрыв	выбух
взрыватель	запал
взыскание	спагнанне
вид вооруженных сил	від узброеных сіл
видимость	бачнасць
видоискатель	відашукальнік
визуальный	візуальны, зрокавы
вилка *(арт.)*	вілка
винт	прапелер, вінт, труба
винтовка	вінтоўка
внезапно	знянацку, неспадзявана, раптоўна
внезапность	раптоўнасць, неспадзеўка
водитель	кіроўца
военнослужащий	вайсковец
воздушный	паветраны
воинский	вайсковы
война	вайна
войска	войскі
действующие в.	дзейсныя войскі
пограничные в.	памежная варта
волна	хваля
взрывная в.	выбуховая хваля
вооружение	узбраенне
вооруженный	узброены
воспламенитель	запал
враг	вораг
вражеский	варожы

время	час
истинное в.	сапраўдны час
вспышка I	сполах
вспышка II *(о войне)*	выбух
вторжение	уварванне
выговор	вымова
выкладка	ладунак
выправка	выпраўка
высота	вышыня
высотомер	вышынямер
выстрел *(процесс)*	стрэл
выстрел *(комплект)*	набой
выучка	вывучка
вышедший из строя	пашкоджаны
вышка	вышка
наблюдательная в.	назіральная вышка

Г

газ	газ
выхлопной г.	выкідны газ
гарнизон	залога, гарнізон
гаубица	гаўбіца
гауптвахта	вязніца, арыштанцкая
гвардия	гвардыя
герб	герб
государственный г.	дзяржаўны герб
героический	гераічны
гильза	гільза, набойніца
гимнастерка	кашуля, вайсковая кашуля
гироскоп	гіраскоп
главнокомандование	галоўнакамандаванне
гладкоствольный	гладкарульны
глазомер	вокамер
глубина	глыбіня
горизонт	гарызонт, небасхіл
горизонталь	гарызанталь
горючее	паліва
госпиталь	шпіталь
господство	панаванне
готовность	гатоўнасць
боевая г.	баявая гатоўнасць
граната	граната
гранатомет	гранатамёт
граница	мяжа
гриф секретности	грыф таемнасці

груз	груз, ладунак
группа	група
группировка	групоўка
гусеница	трак
гусеничный	тракавы

Д

давление	ціск
дальномер	далекамер
дальность	далекасць
д.обнаружения	далекасць выяўлення
данные	дадзеныя
достоверные д.	пэўныя дадзеныя
двигатель	рухавік
д.водяного охлаждения	рухавік вадзянога астуджвання
движение	рух
дегазация	дэгазацыя
дежурный	дзяжурны
дежурство	дзяжурства
дезактивация	дэзактывацыя
дезинсекция	дэзінсекцыя
дэзинфекция	дэзінфекцыя
действие	дзеянне
действия	дзеянні
военные д.	ваенныя дзеянні
деление	дзяленне
дело	справа
совершенно секретное д.	звыштаемная справа
десант	дэсант
детонатор	дэтанатар
детонировать	дэтанаваць
деятельность	дзейнасць
диверсия	дыверсія
совершать диверсию	чыніць дыверсію
дивизион	дывізіён
дивизия	дывізія
механизированная д.	механізаваная дывіз
дизель	дызель
динамит	дынаміт
дистанция	дыстанцыя, водступ
дисциплина	дысцыпліна
воинская д.	вайсковая дысцыпліна
длина	даўжыня
дневальный	днявальны
доброволец	добраахвотнік

довольствие	забеспячэнне
доза	доза
д.облучения	доза абпраменьвання
дозаправка	дазапраўка
дозвуковой	агукавы
дозиметр	дазіметр
дозор	дазор
боевой разведывательный д.	баявы разведвальны дазор
документ	дакумент
секретный д.	таемны дакумент
долг I *(задолженность)*	доўг
долг II *(обязанность)*	абавязак
долгота	даўжыня
должность	пасада
отстранять от должности	адхіляць ад пасады
донесение	данясенне
внесрочное д.	звыштэрміновае данясенне
допрос	допыт
дорога	дарога, шлях, гасцінец
двухпутная д.	двухкалейная дарога
достижение	дасягненне
достоверность	праўдзівасць, пэўнасць
дублирование	дубляж
дуло	руля
дымка	смуга́

Е

еж *(инж.)*	рагач
естественный	натуральны, прыродны
ефрейтор	яфрэйтар

Ж

жалоба	скарга
живучесть	жывучасць
житель	жыхар
местный ж.	тутэйшы жыхар
журнал	журнал
ж.боевых действий	журнал баявых дзеянняў

З

заблаговременно	загадзя

забор	плот, паркан, тын
з.из колючей проволоки	плот з калючага дроту
завеса	заслона
завоевание	заваёва
заградитель	загародчык
заграждение	загарода, загарадзь
задание	заданне
задача	задача
залп	залп
заместитель	заступнік, намеснік
замечание	заўвага
замыкающий	заключны
замысел	задума
з.боя	задума бою
занятия	заняткі
запал	запал
запас	запас
з.топлива	запас паліва
записка	запіска, нататка, цыдулка, аркуш
строевая з.	шыхтовы аркуш
заражение	заражэнне
заряд	набой
заряжать	набіваць
затвор	замок
захват	захоп
захоронение	пахаванне
зачисление	залічэнне
защита	абарона, ахова, засцярога
звание	годнасць
звено	звяно
знак	знак
з.различия	знак адрознення
знаменщик	штандарнік
знамя	штандар
боевое з.	баявы штандар
зона	зона
з.разрушения	зона разбурэння

И

изготовиться	злажыцца
изготовка к бою	злажэнне да бою
излучение	выпраменьванне
измена	здрада
импульс	імпульс

имущество	маёмасць
военное и.	вайсковая маёмасць
индикатор	індыкатар
и.кругового обзора	індыкатар акольнага агляду
инспектировать	інспектаваць
инструкция дежурного офицера	інструкцыя дзяжурнага афіцэра
инструмент	інструмент
шанцевый и.	рыштунак
искусство	мастацтва
военное и.	ваеннае мастацтва
исполняющий обязанности	выканавец абавязкаў
испытания	выпрабаванні
исследование	даследванне
источник	крыніца
истребитель	знішчальнік
высотный и.	вышынны знішчальнік
итог	вынік

К

казарма	казарма
канцелярия	канцылярыя
капсюль	капсуль
караул	варта
почетный к.	ганаровая варта
караульное помещение	вартоўня
караульный	вартаўнічы
карта	карта, мапа
карточка взысканий и поощрений	аркуш спагнанняў і заахвочванняў
каска	каска, сталёвы шолам
катер	кацер
сторожевой к.	вартавы кацер
кафедра	катэдра
керосин	газа
кинжал	кінжал
китель	кіцель
кладовая	камора
кобура	кабура, похва
койка	ложак
колодец	калодзеж, студня
колонна	калона
команда	каманда
исполнительная к.	выканаўчая каманда
предварительная к.	падрыхтоўчая каманда
командир	камандзір
командование *(долж.лица)*	камандаванне

комбинезон	камбінязон
комиссариат	камісарыят
коммутатор	камутатар
комплекс	комплекс
ракетный к.	ракетны комплекс
конвоир	канвойны
координаты	каардынаты
корабль	карабель
к.радиолокационного дозора	карабель радыелакацыйнага дазору
коробка	скрыня
к.передач	скрыня перадач
магазинная к.	набойнік
ствольная к.	замковая камера
корректировать	карэктаваць
костюм	касцюм
котелок	кацялок
крепость	крэпасць, фартэца
круг	круг, кола
спрасательный к.	ратавальнае кола
угломерный к.	вугламерны круг
крупноколиберный	буйнакаліберны
курс цели	курс цэлі
курсант	курсант
кустарник	хмызняк, кустарнік, кустоўе

Л

лагерь	лагер, табар
лебедка	калаўрот
лейтенант	лейтэнант, падпаручнік
старший л.	старшы лейтэнант, паручнік
лента	стужка, пас
гусеничная л.	трак, тракавы пас
орденская л.	ордэнская стужка
летчик	летчык
линейный	лінейны
лист *(бумаги)*	аркуш
полетный л.	палётны аркуш
листок	аркушык, улётка
боевой л.	баявая ўлётка
лодка	човен, чаўнок, лодка
ложный	падманны, фальшывы
лопата	рыдлёўка
луч	промень, прамень
люк	люк, лаз

М

магазин *(оруж.)*	набойнік
коробчатый м.	пачкавы набойнік
маневр	манеўр
осуществлять м.	здзяйсняць манёўр
маневренность	маняўровасць
марш	марш, паход
маршал	маршал
маршрут	маршрут
маска противогаза	ахоўная маска
маскировка	маскіроўка
масло	алей
ружейное м.	збройны алей
машина	машына
медаль	медаль *(м.р.)*
межконтинентальный	міжкантынентальны
меры	меры
м.безопасности	меры бяспекі
м.защиты	меры аховы
дисциплинарные м.	дысцыплінарныя меры
местность	мясцовасць
применяться к местности	дапасоўвацца да мясцовасці
господствующая м.	пануючая мясцовасць
место	месца
местонахождение	месцазнаходжанне
меткий	трапны
меткость	трапнасць
механик	механік
мешок	мяшок, мех, торба
вещевой м.	хатуль, заплечная торба
мина	міна
м.замедленного действия	міна замаруджанага дзеяння
минер	мінёр
минирование	мінаванне
министерство обороны Республики Белорусь	міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
миноискатель	мінашукальнік
миномет	мінамёт
мир *(альт.войне)*	мір
мир *(земля)*	свет
мишень	мішэнь
младший	малодшы
м.по должности	малодшы па пасадзе
м.по воинскому званию	малодшы ў вайсковай годнасці
многозарядный	шматнабойны

мобилизация	мабілізацыя
мотопехота	мотапяхота
мотострелковый	мотастралковы
мощность	магутнасць
мощь	моц
военная м.	ваенная моц
мундир	мундзір
мушка	мушка
мятеж	рокаш

Н

наблюдатель	назіральнік
наблюдение	назіранне
наведение	навядзенне
н.с углом упреждения	навядзенне з вуглом апярэджання
наводка	наводка
непрямая наводка	пасрэдная наводка
прямая наводка	непасрэдная наводка
награда	узнагарода
надежность	надзейнасць
надолб	надаўбень
наказание	кара, пакаранне
наказывать	караць
н.в дисциплинарном порядке	караць дысцыплінарна
налет	налёт
отражать н.	адбіваць налёт
наличие	наяўнасць
нападение	напад
направление	кірунак, напрамак
направляющий	кірунковы
наращивание	узмацненне
нарушение	парушэнне
наряд	прызначэнне
н.вне очереди	прызначэнне па-за чаргой
наставление	настаўленне
наступать	наступаць
наступление	наступленне, наступ
насыпь	насып *(м.р.)*
начальник	начальнік
неблагоприятный	неспрыяльны
небоеспособный	небаяздольны
неопознанный	нераспазнаны
неприятель	непрыяцель
нестроевой	нешыхтовы

ножницы для резки колючей проволоки	нажніцы для рэзкі калючага дроту
ножны	похва
номер	нумар
н.расчета	нумар разліку
носитель	носьбіт

О

обезвреживание	абясшкоджванне
обеспечение	забеспячэнне
обзор	агляд
облучение	абпраменьванне
обмундирование	вопратка
обнаружение	выяўленне, выкрыццё
дальнее о.	далекае выяўленне
обойма	ладунка
оборона	абарона
глубокоэшелонированная о.	глыбокастадыяваная абарона
гражданская о.	грамадзянская абарона
прочная о.	трывалая абарона
оборудование	абсталяванне
обработка	апрацоўка
образец	узор
опытный о.	пробны ўзор, доследны ўзор
обслуживание	абслугоўванне
обстановка	становішча, абставіны
обстрел	абстрэл
обучение	абучэнне
общевойсковой	агульнавайсковы
общение	зносіны
объект	аб'ект
ложный о.	падманны аб'ект
обязанность	абавязак
всеобщая воинская о.	усеагульны вайсковы абавязак
огнемет	агнямёт
огонь	агонь
о.большой плотности	агонь вялікай шчыльнасці
о.на изнурение	агонь на знясільванне
беспокоящий о.	турбоўны агонь
ответный о.	агонь у адказ
перекрестный о.	скрыжавальны агонь
ограждение	загарода, загарадзь
одежда	вопратка
окапывание	акопванне
оккупировать	акупаваць

окоп	акоп
окраска	афарбоўка
округ	акруга
окружение	акружэнне
опасность	небяспека
оперативно-стратегический	аператыўна-стратэгічны
операция	аперацыя
наступательная о.	наступальная аперацыя
оборонительная о.	абаронча́я аперацыя
опись	вопіс *(м.р.)*
оповещение	апавяшчэнне
опознавание	распазнаванне
определение	вызначэнне
опрос	апытванне
опушка леса	узлессе, узлесак
орган	орган
организация	арганізацыя
орден	ордэн
ориентир	арыентыр
орудие	гармата
оружие	зброя
осада	аблога
освидетельствование	асведчанне
осмотр	агляд
ось	вось
о.вращения	вось вярчэння
отбой тревоги	адбой трывогі
ответственность	адказнасць
отделение	дружына
отклонение	адхіленне
вероятное о.	імавернае адхіленне
отлучка	адлучка
отпуск	водпуск, адпачынак
отравляющее вещество	атрутнае рэчыва
отряд	атрад
отступление	адступленне
отход	адыход
преднамеренный о.	наўмысны адыход.
офицер	афіцэр
охрана	ахова
охранение	засцярога
передовое о.	перадавая засцярога
оценка *(уяснение)*	ацэнка
очаг	агмень
о.войны	агмень вайны
очаг *(центр)*	асяродак
о.инфекции	асяродак інфекцыі

очередь	чарга
ошибка	памылка
относительная о.	адносная памылка

П

паек	паёк
палатка	палатка, намёт
панорама	панарама
пара	парад
парашют	парашут
парк	парк
паром	паром
партизан	партызан
патриот	патрыёт
патрон	патрон
патруль	патруль
переброска	перакідка
переводить в боевое положение	пераводзіць у баявы стан
перевооружение	пераўзбройванне
переговоры	перамовы
перегруппировка	перагрупоўка
передатчик	перадатчык
передвижение	рух, перамяшчэнне
передислокация	перадыслакацыя
передышка	перадышка
перемирие	перамір'е
перестроение	перашыхтаванне
перехват	перахоп
персонал	персанал
обслуживающий п.	абслуга
петлица I *(для пуговиц)*	пяцелька, засцібка
петлица II *(на форме)*	нашыўка
пехота	пяхота
пилотирование	пілатаванне
пистолет	пісталет
пища	харч, ежа, страва, яда
план	плян
п.боевого обеспечения	плян баявога забеспячэння
планка	ліштва
орденская п.	ордэнская ліштва
планшет	планшэт
плац	пляц, майдан
плацдарм	апірышча, пляцдарм
плен	палон
плотность	шчыльнасць



площадь	плошча
п.действительного поражения	плошча дзейснага паражэння
побег	уцёк
победа	перамога
поверка	праверка
повреждать	пашкоджваць
погоны	пагоны
пограничник	памежнік
погребение	пахаванне
подвиг	подзвіг
подготовка	падрыхтоўка
боевая п.	баявая падрыхтоўка
поддержка	падтрымка
поджигатель войны	падпальшчык вайны
подкрепление	падмацаванне
подразделение	падраздзел
подрывник	падрыўнік
подчинение	падапрадкаванне,падначаленне
поезд	цягнік
позиция	пазіцыя
заблаговременно подготовленная п.	загадзя падрыхтаваная пазіцыя
позывные	пазыўныя, крыптонімы
поиск	пошук
поле	поле
п.видимости	поле бачнасці
полет	палёт
бреющий п.	прыземны палёт
полк	полк
бомбардировочный авиационный п.	бамбавальны авіяцыйны полк
положение	становішча, пастава
п.противника	становішча непрыяцеля
п."смирно"	пастава на "зважай"
полоса	паласа
п.препятствий	паласа перашкод
полуприцеп	паўпрычэп
помехи	замінкі
помещение	памяшканне
караульное п.	вартоўня
поощрение	заахвочванне
попадание	патрап, трапленне
поправка	папраўка
п.на смещение	папраўка на зрух
поражение	паражэнне, параза
порох	порах
порядок	парадак
уставной п.	статутны парадак

пособие	дапаможнік, дапамога
пост	пост
снимать с поста	здымаць з паста
п.радиационного и химического наблюдения	пост радыяцыйнага і хімічнага назірання
постановка	пастаноўка
п.дымовой завесы	пастаноўка дымавой заслоны
потери	страты
потолок	столь
потребность	патрэба
поход	паход, марш
пояс	пас, пояс, дзяга, папруга
превосходство	перавага
преграда	перашкода
предательство	здрада
предохранитель	бяспечнік, засцерагальнік
предписание	прадпісанне, аркуш
предупреждение	папярэджанне
преимущество	перавага
преодоление	пераадольванне
препятствие	перашкода
преследовать *(кого)*	гнацца *(за кім)*
прибор	прыбор, прылада, апарат
п.управления огнем	прыбор кіравання агнём
привал	прывал, адпачынак
приемник	прыёмнік
приемы	хваты
строевые п.	шыхтовыя хваты
призывник	прызыўнік
приказ	загад
приказание	загад, распараджэнне
приложение	дадатак
применение	скарыстанне,ужыванне, ужытак
присвоение воинского звания	наданне вайсковай годнасці
присяга	прысяга
приводить к присяге	прыводзіць да прысягі
прицел	прыцэл
прицеп	прычэп
проводка	праводка
п.цели	праводка цэлі
проволока	дрот
программа	праграма
п.боевой подготовки	праграма баявой падрыхтоўкі
продвижение	рух, прасоўванне
происшествие	здарэнне
промах	промах, хіба

простор	прастора *(ж.р.)*
проступок	правіна
противник	непрыяцель, супрацІўнік
противостоящий п.	супрацьдзейны непрыяцель
противогаз	газаахоўнік
пулемет	кулямёт
пуля	куля
разрывная п.	выбуховая куля
пункт	пункт
п.питания	пункт сілкавання
командно-наблюдательный п.	камандна-назіральны пункт
пуск	пуск
путеукладчик	калееўкладчык
путевой лист	падарожны аркуш
путь I *(дорога)*	шлях, дарога
боевой п.	баявы шлях
путь II *(ж.д.)*	каляя
пушка	пушка

Р

работа	работа, праца
работы	работы
спасательные р.	ратавальныя работы
равнение	раўненне
радио	радыё
радиовзрыватель	радыёзапал
радиовысотомер	радыёвышынямер
радиолокационная станция	радыёлакацыйная станцыя
р.л.с. дальнего обнаружения	радыёлакацыйная станцыя далекага выяўлення
р.л.с. слежения	радыёлакацыйная станцыя сачэння
радиосеть	радыёсетка
разведка	разведка
разведчик	разведчык
развертывание	разгортванне
развилка дорог	разгалінаванне дарог
развод караулов	развод варты
разводящий	разводны
разглашение военной тайны	розгалас вайсковай таямніцы
разжаловать	пазбавіць годнасці
разрушение	разбурэнне
разрыв *(взрыв)*	выбух
район	раён
р.сосредоточения	раён з'асяроджання

ракета	ракета
многоступенчатая р.	шматступенная ракета
управляемая р.	ракета з кіраваннем
ракетница	ракетніца
ранение	раненне
рапорт	рапарт
расписание	расклад
р.занятий	расклад заняткаў
р.караулов	расклад варты
располагать	размяшчаць
распоряжение	распараджэнне
распределение	размеркаванне
рассредоточение	раз'асяроджванне
расстояние	адлегласць
расформирование	расфармаванне
расчет	разлік
боевой р.	баявы разлік
рацион	рацыён
реактивный	рэактыўны
револьвер	рэвальвер
регулирование	рэгуляванне
резерв	рэзерв
резервный	рэзервовы
рекогносцировка	ракагноска
ремень	пас, дзяга, папруга, папружка
ремонт	рамонт
решение	развязак, вырашэнне
решить	вырашыць
ров	роў, канава
рота	рота
рубеж	рубеж
исходный р.	зыходны рубеж, пачатковы рубеж
конечный р.	канчатковы рубеж
ружье	ружжо, стрэльба
противотанковое р.	супрацьтанкавае ружжо
руководитель	кіраўнік
руководить	кіраваць
рулевой	стырнавы
руль	стырно
ряд *(в строю)*	рад, шэраг
рядовой	шэраговы

С

сабля	шабля
самозарядный	саманабойны

самолет	самалёт
с.дальнего радиолокационного обнаружения	самалёт далекага радыелакацыйнага выяўлення
пилотируемый с.	пілатаваны самалёт
с.-носитель	самалёт-носьбіт
самонаведение	саманавядзенне
санитар	санітар
сапер	сапёр
сапоги	боты
сбор	збор
сведения	звесткі
сверхсрочнослужащий	вайсковец звыштэрміновай службы
свидетельство	пасведчанне
свойства	уласцівасці
связь	сувязь
сдача	здача
с.дел и должности	здача спраў і пасады
секрет *(пост)*	сакрэт
секретно	таемна
совершенно с.	звыштаемна
сектор	сэктар
сержант	сяржант
сетка	сетка
сеть	сетка
сигнал	сігнал
сила	сіла, моц
убойная с.	забіўная сіла
силы	сілы
вооруженные с.	узброеныя сілы
система	сістэма
с.огня	сістэма агню
скатка	скрутка
скафандр	скафандар
высотный с.	вышынны скафандар
склонение	схіленне
скоба	прабой, клямар, дужка
спусковая с.	спускавая дужка
скопление войск	згуртаванне войск
скорострельность	хуткастрэльнасць
скорость	хуткасць
скрытность	таемнасць
служба	служба
с.военных сообщений	служба вайсковых зносін
слушатель академии	слухач акадэміі
смена	змена

смесь	сумесь
взрывчатая с.	выбуховая сумесь
смотр	агляд
строевой с.	шыхтовы агляд
снабжение	забеспячэнне
снаряд	снарад
бронепрожигающий с.	бронепрапальны снарад
снаряжение	рыштунак
совет *(орган)*	рада
совет *(указание)*	парада
военный с.	вайсковая рада
советник	дарадца
совещание	нарада
соглашение	пагадненне
соединение	злучэнне
солдат	жаўнер
сооружение	збудаванне,будынак,пабудова; будаўніцтва, будоўля
соотношение сил	суадносіны сіл
сопло	сапло
соприкосновение	судакрананне
сопровождать	суправаджаць
сопротивление	супраціўленне, апор
сосредоточение	з'асяроджанне
состав I	склад
состав II *(смесь)*	сумесь
состав *(ж.д.)*	цягнік
состояние	стан
сочетание огня и маневра	спалучэнне агню і манёўру
сошник	сашнік
спасательный	ратавальны
специальность	спецыяльнасць
военно-учетная с.	вайскова-ўліковая спецыяльнасць
список	спіс
способность	здольнасць
разрешающая с.	раздзяляльная здольнасць
спутник	спадарожнік
сражение	бітва
средство	сродак
с.массового поражения	сродак масавага паражэння
срок	тэрмін
станина	станіна
станция	станцыя
с.разведки и целеуказания	станцыя разведкі і цэлеўказання
старший	старшы, старэйшы
с.по должности	старшы па пасадзе
с.по званию	старшы ў годнасці

статья	артыкул
ствол	руля
степень	ступень
стойка	пастава
строевая с.	асноўная пастава
сторона	бок
стрелок	стралок
стрельба	стральба
строевик	шыхтовец
строй	шыхт
походный с.	паходны шыхт
развернутый с.	разгорнуты шыхт
разомкнутый с.	раскідны шыхт
суд чести	суд гонару
судно	карабель
съемка	здымкі
сырье	сыравіна

Т

тайна	таямніца
военная т.	вайсковая таямніца
тактика	тактыка
тактический	тактычны
танк	танк
театр военных действий	тэатар ваенных дзеянняў
телеграф	тэлеграф
телетайп	тэлетайп
телефон	тэлефон
темп	тэмп
техника	тэхніка
топливо	паліва
тормоз	тормаз
дульный т.	рульны тормаз
торпеда	тарпеда
торпедировать	тарпедаваць
точка	кропка, пункт
т.попадания	пункт патрапу
точность	дакладнасць, трапнасць
традиция	традыцыя
траншея	траншэя, акоп
трассирующий	трасавальны
тревога	трывога
тренажер	трэнажор
тренировка	трэніроўка
тропа	сцежка

трубка	трубка
электроннолучевая т.	электроннапрамянёвая трубка
турбореактивный	турбарэактыўны
тыл	тыл
тягач	цягач

У

убежище	сховішча
у.для личного состава	сховішча для асабовага складу
убитый *(в бою)*	забіты
увольнение	звальненне
угол	вугал, кут
у.бокового отклонения	вугал бакавога адхілення
у.места цели	вугал месца цэлі
угроза	пагроза
удар	удар
молниеносный у.	бліскавічны ўдар
упреждающий у.	апераджальны ўдар
ударить	ударыць, выцяць
узел	вузел
указатель	указальнік, паказальнік
укрепление	умацаванне
долговременное у.	даўгатэрміновае ўмацаванне
укрытие	сховішча
естественное у.	прыроднае сховішча
уничтожение	знішчэнне
управление	кіраўніцтва, управа
у.боем	кіраўніцтва боем
у.кадров	управа кадраў
у.тыла	управа тылу
у.тылом	кіраўніцтва тылам
управляемый	кіроўны
усиленный	узмоцнены
усилия	намаганні
условия	умовы
успех	поспех
устав	статут
у.внутренней службы	статут унутранай службы
у.гарнизонной и караульной службы	статут гарнізоннай і вартавой службы
боевой у.	баявы статут
дисциплинарный у.	дысцыплінарны статут
полевой с.	палявы статут
строевой с.	шыхтавы статут
устройство	прыстасаванне
счетно-решающее у.	вылічальна-развязвальнае прыстасаванне

учение	вучэнне
командно-штабное у.	камандна-штабное вучэнне
училище	вучылішча, вучэльня
учреждение	установа
ущерб	шкода
уязвимость	ранімасць, паражальнасць

Ф

фельдшер	фельчар
флаг	сцяг
флажок	сцяжок
фланг	фланг
уязвимый ф.	паражальны фланг
фляга	біклага, бідон
форма *(одежда)*	вопратка, уніформа
формировать	фармаваць
фотопулемет	фотакулямёт
фронт	фронт
ф.ударной волны	фронт ударнай хвалі
фронтовик	франтавік
фугас	фугас
фуражка	фуражка
фюзеляж	фюзеляж

Х

характеристика	характарыстыка
ход	ход
х.сообщения	ход зносін
хранение	захоўванне
хранилище	сховішча

Ц

целеуказание	цэлеўказанне
цель *(объект)*	цэль
наводить на ц.	наводзіць на цэль
ц.операции	мэта аперацыі
центр	цэнтар, асяродак
ц.взрыва	цэнтар выбуху
ц.сопротивления	асяродак супраціўлення
цепь	ланцуг
цистерна	цыстэрна

Ч

час	гадзіна
часовой	вартавы
часть *(войсковая)*	частка
материальная ч.	матэрыяльная частка
честь	гонар
отдавать ч.	выказваць пашану
численность	лік, колькасць

Ш

шаг	крок
ш.не в ногу	вольны крок
походный ш.	роўны крок
строевой ш.	вучэбны крок
шинель	шынэль *(м.р.)*
шлем	шолам
шлемофон	шоламафон
шомпол	шомпал
шоссе	шаша
шпион	шпіен, віж
штаб	штаб
штык	штых

Щ

щель *(окоп)*	акоп
щуп	мацка, зонд

Э

экипаж	залога
э.танка	залога танка
экран индикатора	экран індыкатара
элемент	элемент
эмблема	эмблема, адзнака
эскадрилья	эскадрылья
экскорт	экскорт, пачот
эшелон I *(группа войск)*	стадыя
эшелон II *(ж.д.)*	цягнік
первый э.	першая стадыя
эшелонирование	стадыяванне
э.по высоте	стадыяванне па вышыні

Я

ящик	скрыня, скрынка
зарядный я.	набойная скрынка
патронный я.	патронная скрынка

КОМАНДЫ И КОМАНДНЫЕ СЛОВА
КАМАНДЫ І КАМАНДНЫЯ СЛОВЫ

Автоматы на - ГРУДЬ!	Аўтаматы на - ФРОНТ!
Автоматы на грудь, по разделениям, делай-РАЗ, делай-ДВА, делай-ТРИ!	Аўтаматы на фронт, па раздзелах, рабі-РАЗ, рабі-ДВА, рабі-ТРЫ!
БЕГОМ!	БЕГАМ!
Бегом - МАРШ!	Бегам - РУШ!
Взвод, в колонну по три, шагом - МАРШ!	Звяз, у калону па тры, крокам - РУШ!
Взвод, под Знамя - СМИРНО!	Звяз, на Штандар - ЗВАЖАЙ!
Взвод, под Знамя - СМИРНО, на кара-УЛ!	Звяз, на Штандар - ЗВАЖАЙ, зброю на - ФРОНТ!
В колонну по одному (по два, по три, по четыре) - СТАНОВИСЬ!	У калону па аднаму (па два, па тры, па чатыры) - ЗБОРКА!
ВНИМАНИЕ!	УВАГА!
ВНИМАНИЕ, ДЕЛАЙ, ЧТО Я!	УВАГА, РАБІ, ШТО Я!
В одну шеренгу (В две шеренги) - СТАНОВИСЬ!	У адзін шэраг (У два шэрагі) - ЗБОРКА!
ВОЛЬНО!	СПАВОЛЬ!
ВПЕРЁД!	НАЎПРОСТ!
В РУЖЬЕ!	ЗА ЗБРОЮ!
ВСЕ КРУГОМ!	УСЕ ТЫЛ ФРОНТ!
ВСТАТЬ!	УСТАЦЬ!
ВСТАТЬ, СМИРНО!	УСТАЦЬ, ЗВАЖАЙ!
ВЫЙТИ ИЗ СТРОЯ!	ВЫЙСЦІ З ШЫХТУ!
Выйти из строя на три шага!	Выйсці з шыхту на тры крокі!
ГЛУШИ МОТОР!	ГЛУШЫ МАТОР!
Головные уборы - НАДЕТЬ!	Галаўныя ўборы - НАДЗЕЦЬ!
Головные уборы - СНЯТЬ!	Галаўныя ўборы - ЗНЯЦЬ!
Два шага вперед (назад), шагом - МАРШ!	Два крокі наўпрост (назад), крокам - РУШ!
Два шага вправо (влево), шагом - МАРШ!	Два крокі ўправа (ўлева), крокам - РУШ!
Дежурные, на линию!	Дзяжурныя, на лінію!
До свидания, товарищи!	Да пабачэння, спадарства!
ЕСТЬ!	РЭЙ!
ЗАВОДИ!	ЗАВОДЗЬ!
ЗА МНОЙ!	ЗА МНОЮ!
За мной - МАРШ!	За мной- РУШ!

За мной, шагом - МАРШ!	За мной, крокам - РУШ!
ЗАПРАВИТЬСЯ!	Рыштунак да - ЛАДУ!
ЗАРЯЖАЙ!	НАБІВАЙ!
ЗА СПИНУ!	ЗА ПЛЕЧЫ!
Здравия желаем (желаю)!	Вітаем (Вітаю)!
Здравствуйте, товарищи!	Вітаю, спадарства!
Знаменный взвод - ВПЕРЕД!	Штандарны звяз - НАЎПРОСТ!
Знаменщик, за мной, шагом - МАРШ!	Штандарнік, за мной, крокам - РУШ!
ИДТИ В НОГУ!	РОЎНЫ КРОК!
ИДТИ НЕ В НОГУ!	ВОЛЬНЫ КРОК!
К БОЮ!	ДА БОЮ!
К МАШИНАМ!	ДА МАШЫН!
К но-ГЕ!	Зброю - СТАЎ!
КО МНЕ!	ДА МЯНЕ!
Ко мне, шагом - МАРШ!	Да мяне, крокам - РУШ!
КОРОЧЕ ШАГ!	ДРОБНЫ КРОК!
Кру-ГОМ!	Тыл - ФРОНТ!
К торжественному маршу,повзводно (поротно, побатальонно) на одного линейного (на двух,трех линейных) дистанция, первый взвод (первая рота, первый батальон) прямо, остальные напра-ВО!	Да ўрачыстага руху, пазвязна (паротна, пабатальённа) на аднаго лінейнага (на двух,трох лінейных) водступ, першы звяз (першая рота, першы батальен) проста, астатнія, права - ФРОНТ!
ЛЕВЕЕ!	ЛЯВЕЙ!
Левое плечо вперед - МАРШ!	Права кірунак - РУШ!
Левое плечо вперед, шагом - МАРШ!	Права кірунак, крокам - РУШ!
ЛОЖИСЬ!	ЛЕГЧЫ!
НАЗАД!	НАЗАД!
Нале-ВО!	Лева - ФРОНТ!
Налево - РАВНЯЙСЬ!	Лева - РАЎНУЙ!
НА МЕСТЕ!	НА МЕСЦЫ!
На месте, шагом (бегом) - МАРШ!	На месцы, крокам (бегам) - РУШ!
На первый и второй-РАССЧИТАЙСЬ!	На першы і другі - ЛІЧЫ!
На пле-ЧО!	На пля-ЧО!
На пост шагом - МАРШ!	На пост крокам - РУШ!
Напра-ВО!	Права - ФРОНТ!
Направо - РАВНЯЙСЬ!	Права - РАЎНУЙ!
На ре-МЕНЬ!	На - ПАС!
На ру-КУ!	На ру-КУ!
Начальник караула - КО МНЕ, остальные - НА МЕСТЕ!	Начальнік варты - ДА МЯНЕ, астатнія - НА МЕСЦЫ!
Никак нет!	НЕ!

Оркестр, играй сбор!	Аркестар, грай збор!
ОТБОЙ!	АДБОЙ!
ОТСТАВИТЬ!	ПАКІНЬ!
Под Знамя, СМИРНО, на кара-УЛ!	На Штандар, ЗВАЖАЙ, зброю на ФРОНТ!
ПОДЪЕМ!	ПАД'ЁМ!
Полк, под Знамя, СМИРНО. Для встречи справа (слева, с фронта) - на кара-УЛ!	Полк, пад Штандар, ЗВАЖАЙ! Для спаткання справа (злева, з фронту) зброю на - ФРОНТ!
Полк, под Знамя, СМИРНО, равнение на - ПРАВО!	Полк, пад ШТАНДАР, ЗВАЖАЙ, направа (налева, на фронт) - РАЎНУЙ!
ПОЛНЫЙ ШАГ!	ПОЎНЫ КРОК!
Пол-оборота нале-ВО (напра-ВО)!	Лева - СКОС (Права - СКОС)!
ПОЛШАГА!	ПАЎКРОЧ!
ПО МЕСТАМ!	ПА МЕСЦАХ!
По порядку - РАССЧИТАЙСЬ!	Па парадку - ЛІЧЫ!
ПРАВЕЕ!	ПРАВЕЙ!
Правое (левое) плечо вперед, шагом - МАРШ!	Лева (права) кірунак, крокам - РУШ!
ПРИНЯТЬ ВПРАВО!	ПРАВА ЗБОЧ!
ПРИСТУПИТЬ К ПОВЕРКЕ!	ПРЫСТУПІЦЬ ДА ПРАВЕРКІ!
Противогазы - СНЯТЬ!	Газаахоўнікі - ЗНЯЦЬ!
ПРЯМО!	ПРОСТА!
РАВНЯЙСЬ!	РАЎНУЙ!
РАВНЯЙСЬ! СМИРНО! Для встречи справа (слева, с фронта), на кара-УЛ!	РАЎНУЙ! ЗВАЖАЙ! Для спаткання справа (злева, з фронту) зброю на - ФРОНТ!
РАВНЯЙСЬ! СМИРНО! На кара-УЛ!	РАЎНУЙ! ЗВАЖАЙ! Зброю на-ФРОНТ!
РАЗОЙДИСЬ!	РОСКІД!
РАЗОМКНИСЬ!	РОССТУП!
РАЗРЯЖАЙ!	ВЫБІВАЙ!
Ре-ЖЕ!	Ра-ДЗЕЙ!
Слушай мою команду!	Слухай маю каманду!
Слушайте все! (сигнал)	Слухайце ўсе!
СМИРНО!	ЗВАЖАЙ!
СМИРНО, равнение на - ПРАВО (на - ЛЕВО, на - СЕРЕДИНУ)!	Права (Лева, Фронт) - ЗВАЖАЙ!
СМИРНО, на кара-УЛ!	ЗВАЖАЙ, зброю на - ФРОНТ!
Сом-КНИСЬ!	СОСТУП!
С поста, шагом - МАРШ!	З паста, крокам - РУШ!
СТАНОВИСЬ!	ЗБОРКА!
СТАТЬ В СТРОЙ!	СТАЦЬ У ШЫХТ!
СТОЙ!	СТОЙ!
Стой! Кто идет ?	Стой! Хто ідзе ?

Стой, назад!	Стой, назад!
Стой, обойти вправо (влево)!	Стой, абысці ўправа (улева)!
Стой, стрелять буду!	Стой, страляць буду!
Строевым шагом - МАРШ!	Вучэбным крокам - РУШ!
Так точно!	Так!
Товарищи офицеры!	Спадары афіцэры!
Товарищ полковник! Во время моего дежурства происшествий не случилось. Дежурный по полку майор ...	Спадар палкоўнік! Пад час майго дзяжурства здарэнняў не адбылося. Дзяжурны па палку маер ...
Товарищ полковник, разрешите обратиться к капитану ...	Спадар палкоўнік, дазвольце звярнуцца да капітана ...
УВЕЛИЧИТЬ ДИСТАНЦИЮ!	ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВОДСТУП!
УВЕЛИЧИТЬ СКОРОСТЬ!	ПАВЯЛІЧЫЦЬ ХУТКАСЦЬ!
УМЕНЬШИТЬ ДИСТАНЦИЮ!	ПАМЕНШЫЦЬ ВОДСТУП!
УМЕНЬШИТЬ СКОРОСТЬ!	ПАМЕНШЫЦЬ ХУТКАСЦЬ!
УРА!	РУБОН!
Часовой, сдать пост!	Вартавы, здаць пост!
ЧАЩЕ ШАГ!	ЧАСТЫ КРОК!
Шагом - МАРШ!	Крокам - РУШ!
ШИРЕ ШАГ!	ДОЎГІ КРОК!
Я!	Я!

СКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА

М.Байкоў і А.Бараноўскі. Практычны беларускі вайсковы слоўнік. Ч.1 (расійска-беларуская). Менск, 1927

Ваенны расійска-беларускі слоўнік / Бел.Акад.навук. Ін-т моваэнаўства. ваенна-тэрміналагічная камісія. Менск, 1933

Зьніч. Вайсковая стылістыка / Выд. Бел. вайсковай камісіі. Менск, 1919

Каманды па-беларуску / Браслаў, 1920

С.Гураў. Палявая варта / Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Сэктар вайсковай літаратуры. Менск, 1932

С.Гейнрыкс. Дзействы асобнай палкавой гарматы / Дзяржаўнае ваеннае выдавецтва БССР. Менск, 1932

Праф. У.Генэрозаў. Тэорыя і практыка стральбы куляй і шротам / Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Менск, 1933

С.Азар'еў і Н.Балашоў. Баявая служба чырвонаармейца-хіміка / ДВБ. Сэктар ваеннай літаратуры. Менск, 1936

В.Аляксееў і І.Хорыкаў. Стралкова-тактычная падрыхтоўка кулямётнага аддзяленьня і разьдзелу / Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Менск, 1931

Страявы статут Б.К.А. / Менск, 1944

Шыхтовы статут Беларускага войска /выдавецтва "Рокаш", г.Прыазёрск, Казахстан, 1992 г.

Семиязычный военный словарь. Русский, болгарский, венгерский, немецкий, польский, румынский і чешский языки. Составители И.М.Бойко, В.С.Бакаленко, В.Л.Куценко / Военное издательство Министерства обороны СССР. Москва, 1971

В.Ластоўскі. Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік / Коўна, 1924

С.М.Грабчыкаў. Русско-белорусский словарь / Минск, "Народная асвета", 1990

В.А.Кочергина. Санскритско-русский словарь / Москва, "Русский язык", 1987

"ТЭХНАЛОГІЯ" - ДЗЕЛЯ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ!

Тэл./факс : (0172) 21-77-40

"ТЭХНАЛОГІЯ" - гэта:

- **эскізы пячатак;**
- **распрацоўка арыгінал-макетаў, газет, кніг, слоўнікаў;**
- **распрацоўка фірменных знакаў, лагатыпаў, рэкламы і яе размяшчэнне (у тым ліку, у прэсе ЗША);**
- **усталяванне найнавейшых выдавецкіх камп'ютарных праграм.**

Рэдактар *В.Багдановіч*

Слоўнік змакетаваны на выдавецкай сістэме кампаніі "ТЭХНАЛОГІЯ", якая ўсталеўвалася пры дапамозе нашых суайчыннікаў з ЗША Янкі Ханенкі, Язэпа Арцюха, Васіля Мельяновіча, Міхася Наўмовіча з Францыі, а таксама Адама Палюховіча, прэзідэнта фірмы "DAINOVA".

Шчырае ім дзякуй!

Камп'ютарны дызайн Сяргея Новіка і Сяргея Еўтушэнкі, студэнтаў факультэта радыефізікі і электронікі Беларускага Дзяржаўнага ўніверсітэта.

Надрукавана ў друкарні інстытута БГВГ Зак. 210 Тыр. 1000
Наклад 1000 асобнікаў. Заказ

Незалежная выдавецкая кампанія *"Тэхналогія"*. Ліцэнзія ЛВ №439.
220125, г.Мінск, Магілёўская, 43